# Маладым паўсюль

## Прадстаўляем лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта

**Сёлета ўладальнікамі гранд-прэмій з прысваеннем звання лаўрэата спецыяльнага фонду сталі 13 пераможцаў міжнародных мастацка-творчых спаборніцтваў. Спецыяльныя прэміі прысуджаны – 26 прадстаўнікам творчай моладзі і 12 творчым калектывам з розных рэгіёнаў нашай рэспублікі. Прэміяй «За ўклад у выхаванне таленавітай моладзі» адзначаны 13 педагогаў. Прадстаўляем вашай увазе лаўрэатаў спецыяльнага фонда сярод мастацкіх калектываў.**



*Ансамбль народнай песні «Дзвінскія пераліві».*

***Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, народны харэаграфічны ансамбль «Сузор'е» дзяржаўнай установы «Палац культуры г. Салігорска», уладальнік сярэбранага медаля Адкрытых дзіцячых Дэльфійскіх гульняў краін-удзельніц СНД (Кыргызстан, 2024 год). Кіраўнік – Вадзім Пятровіч Матанцаў.***

Калектыў заснаваны ў 1999 годзе і на працягу ўсёй сваёй творчай дзейнасці ставіць у прыярытэт захаванне лепшых традыцый беларускай танцавальнай культуры, выхаванне эстэтычнага густу аўдыторыі на лепшых узорах народнага харэаграфічнага мастацтва. Ансамбль прадстаўляе Беларусь у краінах Садружнасці, дзе нязменна атрымлівае самыя высокія ацэнкі прафесійных крытыкаў і аўдыторыі за ўзровень майстэрства, нацыянальны каларыт, высокі маральны і духоўны патэнцыял. Калектыў вядзе актыўную гастрольна-канцэртную і грамадска-культурную дзейнасць, з'яўляецца лаўрэатам і дыпламантам многіх міжнародных, рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў.

У 2024 годзе на высокім арганізацыйным і мастацкім узроўні ансамбль «Сузор'е» прыняў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні гала-канцэрта майстроў мастацтва Мінскай вобласці ў рамках Рэспубліканскага фэстываля «Беларусь – мая песня» (г. Мінск), рэспубліканскім патрыятычным форуме «Калі мы адзіны», прысвечаным Дню народнага адзінства (г. Мінск, 2024), у праграме «Час выбраў нас» у рамках рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» (г. Маладзечна, г. Салігорск).

***Вакальны дуэт дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа №41 г. Магілёва» ў складзе Лізаветы Івуцінай і Ульяны Цішчанка, лаўрэат XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Інга Валянцінаўна Рэшко.***

***Ансамбль кафедры харэаграфіі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», лаўрэат XI Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод», дыплом I ступені (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Святлана Вячаславаўна Гуткоўская.***

У калектыў, арганізаваны ў 1995 годзе, уваходзяць студэнты спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» па кірункам «народны танец» і «сучасны танец». Рэпертуар ансамбля налічвае каля 40 арыгінальных харэаграфічных кампазіцый, створаных па матэрыялах фальклору, беларускага народна-сцэнічнага танца, сучаснай харэаграфіі рознай жанравай і тэматычнай накіраванасці. Большасць канцэртных нумароў у рэпертуары калектыва адзначаны прызамі на міжнародных творчых конкурсах. Ансамбль – актыўны ўдзельнік мастацкіх праектаў і канцэртных праграм рэспубліканскага маштабу: Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар», Цырымонія інаўгурацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Цырымонія ўручэння прэмій кіраўніка дзяржавы «За духоўнае Адраджэнне», Навагодні баль таленавітай моладзі, Гала-канцэрт творчага марафону «Адраджэнне», Міжнародны фестываль «Моладзь – за Саюзную дзяржаву», шматлікія праекты Белтэлерадыёкампаніі і іншыя.

Творчая геаграфія калектыву не абмяжоўваецца нашай краінай. Ён паспяхова выступаў у Іспаніі, Партугаліі, Германіі, Францыі, Латвіі, Польшчы, Расіі, Таджыкістане, Княстве Манака і інш.

Ансамбль кафедры харэаграфіі ўваходзіць у лік лепшых хаэраграфічных калектываў нашай рэспублікі і ўжо тройчы з'яўляецца ўладальнікам Гранд-прэміі і шматразова заахвочвальнай прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

***Ансамбль народнай песні «Дзвінскія пераліві» установы адукацыі «Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж», уладальнік Гран-пры XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Нэлі Леанідаўна Бароўская.***

Ансамбль народнай песні «Дзвінскія пераліві» створаны ў 2022 годзе, у яго склад уваходзяць 14 чалавек – вучні і выкладчыкі каледжа ва ўзросце 15–25 гадоў. Калектыў быў арганізаваны ў межах практычнага навучання студэнтаў для здзяйснення канцэртнай дзейнасці, папулярызацыі народна-песеннага мастацтва. У рэпертуар ансамбля ўваходзяць беларускія і рускія народныя песні, аўтарскія творы і апрацоўкі народнай песні. За невялікі тэрмін дзейнасці калектыў ужо прыняў удзел у шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах: XI Міжнародны фальклорны фестываль «Як на рэчцы было на Фантанке» (Санкт-Пецярбург, 2022 год), I Міжнародны расійска-кітайскі анлайн-конкурс «Краіна танцуючых драконаў» (Пекін, 2022 год), Міжнародны конкурс мастацтваў «Першыя ластаўкі – 2023» (Масква, 2023 год), XII Рэспубліканскі творчы радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі», I Міжнародны расійска-індыйскі шматжанравы конкурс «Лот Мот Холі» у рамках міжнароднага фестывалю мастацтваў «Культурны абмен» (Нью-Дэлі, 2023) і іншыя.

***Вакальны ансамбль «Art Energy» установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў», лаўрэат XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Ірына Алегаўна Кулагіна.***

У калектыў уваходзяць студэнты і выкладчыкі аддзялення «Мастацтва эстрады (спеў)». Ансамбль з'яўляецца актыўным удзельнікам рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў, сярод якіх Міжнародны фестываль «Славянскі базар», Міжнародны конкурс «*Golden Time London*», Міжнародны анлайн-конкурс «*DiGi-Talenty*» і іншыя.

***Вакальны ансамбль «Карагод» дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў №1 імя Я. К. Цікоцкага г. Бабруйска», лаўрэат***



*Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, народны харэаграфічны ансамбль «Сузор'е» дзяржаўнай установы «Палац культуры г. Салігорска».*

### Рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, якім зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

На гэтыя мэты з рэспубліканскага бюджэту за кошт сродкаў рэзервовага фонду будзе накіравана каля Br560 тыс.

Стыпендыі Прэзідэнта Беларусі назначаны 185 студэнтам ВНУ. Гранд-прэмій з прысваеннем звання лаўрэата спецыяльнага фонду ўдастоены 11 пераможцаў міжнародных алімпіяд і конкурсаў. Заахвочаны спецыяльнымі прэміямі 92 навучэнцы, курсанты і студэнты.

Аказана матэрыяльная падтрымка студэнцкай навуковай лабараторыі «Геаінфармацыйныя сістэмы і тэрытарыяльнае кіраванне» Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна для далейшага развіцця навуковых даследаванняў у галіне геаінфарматыкі і распрацоўкі навучальных і прыкладных геаграфічных інфармацыйных сістэм.

Прынянцце распараджэння будзе садзейнічаць матывацыі прадстаўнікоў адоранай моладзі, стварыць умовы для іх далейшай паспяховай вучобы і прафесійнага росту, а таксама будзе служыць дадатковым стымулам для педагогаў.

# у нас дарога

## Рэспублікі Беларусь

***XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Марына Віктараўна Арцёмчык.***

Ансамбль існуе з 2010 года. Сёння калектыў налічвае 15 вакалістаў ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў. У рэпертуары вакальнага ансамбля – беларускія народныя і аўтарскія песні. Перамога ў радыёконкурсе «Маладыя таленты Беларусі» дала магчымасць ансамблю прэтэндаваць на атрыманне прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

– Гэта найвышэйшае дасягненне для нашага калектыву, якое патрабавала доўгай і руплівай працы ўсіх удзельнікаў ансамбля. Гэта значная падзея для нас усіх. Вялікая заслуга ў гэтым як удзельнікаў калектыву, так і кіраўніцтва школы, якое падтрымлівала нас ва ўсіх пачынаннях, – адзначыла кіраўнік ансамбля Марына Арцёмчык.

***Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны ансамбль танца «Мілавіца» дзяржаўнай установы адукацыі «Уваравіцкі цэнтр дзіцячай творчасці Буда-Кашалёўскага раёна», лаўрэат XI Міжнароднага фестываля харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Людміла Аляксандраўна Кабаева.***

Ансамбль заснаваны ў 1994 годзе. У калектыў уваходзіць амаль 80 чалавек ва ўзросце ад 3 да 21 года. Узорны ансамбль «Мілавіца» не адно дзесяцігоддзе з'яўляецца візітнай карткай Буда-Кашалёўскага раёна. Ніводнае свята не абыходзіцца без харэаграфічных нумароў калектыву. Яго творчая геаграфія ўжо даўно выйшла за межы раёна і нават рэспублікі. Ансамбль «Мілавіца» выступаў на міжнародных пляцоўках у Германіі, Балгарыі, Расіі, Японіі.



*Вакальны ансамбль «Карагод» дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў №1 імя Я. К. Цікоцкага г. Бабруйска».*



*Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны ансамбль танца «Мілавіца» дзяржаўнай установы адукацыі «Уваравіцкі цэнтр дзіцячай творчасці Буда-Кашалёўскага раёна».*

***Вакальны ансамбль «Asteria» установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў», уладальнік Гран-пры XXI Рэспубліканскага конкурсу эстрадных выканаўцаў «Белазаўскі акорд» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Алена Сяргееўна Працко.***

***Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны харэаграфічны ансамбль «Алеся» ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў», лаўрэат XXXV Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Ігар Мікалаевіч Шувалаў.***

Ансамбль існуе з 1995 года. У 1999-м калектыву было прысвоена званне «Народны аматарскі калектыў» за ўнёсак у развіццё нацыянальных культурных традыцый і актыўную канцэртную дзейнасць. Сёння ў ансамбль уваходзяць 25 студэнтаў спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва». Народны харэаграфічны ансамбль «Алеся» – пастаянны ўдзельнік міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў: Міжнародны фестываль «Za Гранью», Міжнародны фестываль «Залатая пчолка», Міжнародны конкурс «Таленты Расіі», Міжнародны анлайн-конкурс «Online Wave» (Іспанія).

***Калектыў «Лабараторыя эстраднага танца БДУКМ» установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», лаўрэат XI Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Вольга Аляксандраўна Наўроцкая.***

Калектыў створаны дацэнтам кафедры харэаграфіі Вольгай Наўроцкай у 2021 годзе з мэтай дадатковага творчага развіцця ў выканальніцкай і балетмайстарскай сферах прафесійнай дзейнасці студэнтаў профілю «эстрадны танец». Агульная колькасць удзельнікаў творчага калектыву – больш за 40 чалавек. За дастаткова кароткі тэрмін існавання калектыў ужо паўдзельнічаў у шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях, сярод іх – XV Маладзёжныя Дэльфійскія гульні краін-удзельніц СНД, Рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва «Дэнс кангрэс» і інш.

«Лабараторыя эстраднага танца БДУКМ» таксама прымала ўдзел у творчых праектах і канцэртах: Гала-канцэрт «Подзвіг народа бессмяротны» ў межах тэлевізійнага праекта «Плошча перамогі», Гала-канцэрт «Беларусь адзіная» да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і інш.

***Узорны ансамбль гарманістаў «Картузяне» дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Бяроза», лаўрэат XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Ігар Рыгоравіч Сірычнік.***

Ансамбль створаны ў 1992 годзе. А званне ўзорнага атрымаў у 2011-м. Сёння ў склад калектыву ўваходзяць 14 выканаўцаў ва ўзросце ад 6 да 14 гадоў. Многія з былых удзельнікаў звязалі сваё жыццё з музычным мастацтвам. Творчыя дасягненні ўзорнага ансамбля пацвярджаюць шматлікія дыпломы I-III ступені за ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях і конкурсах. Сярод самых вядомых – Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур «Суквецце культур», абласныя фестывалі народнай музыкі «Грай, гармонік!», міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» і іншыя.

***Узорны ансамбль народнай песні «Святкі» дзяржаўнай установы адукацыі «Палац дзяцей і моладзі «Золак» г. Мінска», лаўрэат XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Наталля Мікалаеўна Буліцкая.***

Калектыў створаны ў 1996 годзе ў Палацы дзяцей і моладзі «Золак». Ансамбль не абмяжоўваецца народнай музыкай і працуе ў розных стылях: як традыцыйны фальклор, так і творы ў сучасных аранжыроўках. У рэпертуары ансамбля беларускія, каляндарна-абрадавыя, сямейна-побытавыя песні, сцэнічныя пастаноўкі абрадаў. Калектыў актыўна ўдзельнічае ў раённых, гарадскіх, рэспубліканскіх конкурсах і фестывалях. У творчым партфоліа ансамбля – удзел у фестывалях у Расіі, Балгарыі, Польшчы, Італіі, Швецыі і інш.

***Узорны інструментальны ансамбль «Джайв-акорд» дзяржаўнай установы адукацыі «Жодзінская дзіцячая школа мастацтваў», уладальнік Гран-пры XIII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі» (Беларусь, 2024 год). Кіраўнік – Вольга Іванаўна Кавалевіч.***

Калектыў спецыялізуецца на выкананні джазавай і эстраднай музыкі. Склад ансамбля невялікі – усяго тры ўдзельнікі, аднак гэта не перашкаджае калектыву дасягаць музычных вышынь. Сярод апошніх дасягненняў інструментальнага ансамбля: Гран-пры I ступені ў конкурсе «У рытме джазу» і інш.

***Дуэт установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная харэаграфічная гімназія-каледж» у складзе Алісы Абрамовіч і Фёдара Міхаленкі, лаўрэат XV Міжнароднага фестываля-конкурса сольнага танца імя Махмуда Эсамбаева (Расія, 2024 год). Кіраўнік – Ганна Сяргееўна Леппо.***

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**
**Фота з адкрытых крыніц**



*Узорны інструментальны ансамбль «Джайв-акорд» дзяржаўнай установы адукацыі «Жодзінская дзіцячая школа мастацтваў».*